« »

1-га чэрвеня, у рамках святкавання Дня абароны дзяцей, у ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна” адкрылася традыцыйная выстава творчых работ Адукацыйнага цэнтра “Арт-квадрат” пры мастацка-графічным факультэце ВДУ імя П.М. Машэрава. У гледачоў з’явілася магчымасць пазнаёміцца з творчасцю юных мастакоў цэнтра, убачыць цікавыя і разнастайныя работы, якія выкананыя ў розных тэхніках і ўвасабляюць смелыя аўтарскія ідэі і дзіцячую фантазію.

« »

5 чэрвеня ў выставачнай зале МГФ ВДУ імя П.М. Машэрава прайшло адкрыццё першай персанальнай выставы мастачкі з КНР Шэнь Яньчай (куратар М. Цыбульскі), якая прыехала вучыцца ў англамоўнай магістратуры па спецыяльнасці “Мастацтвазнаўства”. Да гэтага дзяўчына закончыла педагагічны ўніверсітэт Лінань (КНР), працавала дызайнерам, мастаком-фрылансерам і педагогам па мастацтве ў сваёй краіне. У экспазіцыі выставы, што была падрыхтавана пры дапамозе Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва, прадстаўлены кампазіцыі ў традыцыйным для класічнага кітайскага жывапісу жанры шань-шуй, якія маладая мастачка напісала ў Віцебску, але прысвяціла іх Кітаю.

« »

12-га чэрвеня ў Мінску ў трох залах мастацкай галерэі “Універсітэт культуры” адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця выставы “Творчы шлях: 45 гадоў Дзіцячай мастацкай школе г. Віцебска”. Ініцыятарам і адным з арганізатараў мерапрыемства стала кафедра выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава (куратары М. Цыбульскі, В. Васёха, І. Праснякова). Гэта выстава – яркае адлюстраванне творчай спадчыны і дасягненняў вучняў за доўгія гады існавання школы. У экспазіцыі прадстаўлены творчыя работы навучэнцаў апошніх гадоў, а таксама з фонду школы.

Дзіцячая мастацкая школа г. Віцебска, заснаваная ў 1979 годзе, з’яўляецца спадкаемніцай традыцый Віцебскай мастацкай школы. Яе вучні неаднаразова станавіліся лаўрэатамі рэспубліканскіх і міжнародных мастацкіх конкурсаў. За больш як саракагадовы перыяд працы школы 18 яе вучняў сталі стыпендыятамі, а 9 навучэнцаў адзначаны прэміямі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Дзіцячая мастацкая школа г. Віцебска з’яўляецца арганізатарам такіх праектаў, як міжнародны конкурс-выстава “Перспектыва”, “Арт-аб’ект года”, Міжнародны дзіцячы пленэр, прысвечаны І.Я. Рэпіну. Дадзеная выстава не толькі свята творчасці і майстэрства вучняў, але і адлюстраванне ролі высокакваліфікаваных выкладчыкаў, якія накіроўвалі дзяцей на працягу ўсяго шляху навучання. Менавіта дзякуючы ім школа змагла дасягнуць такіх выдатных вынікаў. Сярод педагогаў гэтай школы ёсць нямала выпускнікоў мастацка-графічнага факультэта, членаў Саюза мастакоў і Саюза дызайнераў, якія прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы абітурыентаў і для сваёй альма-матар.

« »

9-га ліпеня ў выставачнай зале мастацка-графічнага факультэта адбылося адкрыццё выстаўкі “Тэкстыльны дыялог” у рамках пагаднення аб міжнародным супрацоўніцтве ў галіне адукацыйнай і грамадска-культурнай дзейнасці паміж МГФ ВДУ імя П.М. Машэрава і Архангельскай дзіцячай школай народных рамёстваў. На выстаўцы былі прадстаўлены творчыя работы Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў, кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і тэхнічнай графікі мастацка-графічнага факультэта ВДУ, народнага клуба аматараў шыцця “Рошва” Полацкага цэнтра народных рамёстваў і Дзіцячай школы народных рамёстваў (Архангельск, Расійская Федэрацыя).

« »

5-га верасня ў Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В.А. Грамыкі пачала працаваць персанальная выстава дацэнта кафедры выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава, мастака і мастацтвазнаўцы Міхася Цыбульскага пад назвай “Нябёсы”. Творцам прадстаўлены пейзажныя кампазіцыі ў тэхніцы алейнага жывапісу, якія былі выкананы ў розны час і ў якіх вобраз нябёсаў заняў адно з цэнтральных месцаў.

« »

12-га верасня ў ДУА “Сярэдняя школа № 15” г. Віцебска адбылося адкрыццё мастацкай выстаўкі дацэнтаў кафедры выяўленчага мастацтва УА “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, кандыдатаў мастацтвазнаўства, сяброў ГА “Беларускі саюз мастакоў” Аляксея Віктаравіча і Сяргея Віктаравіча Мядзвецкіх. Акрамя гэтага маладыя вучоныя прэзентавалі на мерапрыемстве падрыхтаваную імі манаграфію “Віцебская мастацкая школа”.

« »

20 верасня ў выставачнай зале мастацка-графічнага факультэта адкрылася персанальная фотавыстава дацэнта кафедры фундаментальнай і прыкладной біялогіі факультэта хіміка-біялагічных і геаграфічных навук Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, педагога і даследчыка Леанарда Мяржвінскага. У экспазіцыі пад назвай “Зачараваны прыгажосцю” прадстаўлена больш 40 фотаздымкаў краявідаў і аб’ектаў цудоўнай прыроды Беларускага Паазер’я. Многія з фотаздымкаў увайшлі ў кнігу “Віцебская вобласць. Прыродныя рэсурсы і ахова навакольнага асяроддзя” (2016), фотаальбом “Жамчужыны Віцебшчыны = Pearls of Vitebsk region” (2017), навукова-папулярнае выданне “Сімфонія стагоддзяў” з серыі “Культурная спадчына Беларусі” (2017) і многія іншыя.